# § 15. Еўрапейская літаратура і мастацтва XVII–XVIII стст.

**Успомніце.** *Якія мастацкія стылі былі распаўсюджаны ў Сярэднія вякі? Пералічыце асаблівасці культуры Адраджэння.*

У XVII–XVIII стст. у Еўропе складвалася адзіная мастацкая культура, якая пры ўсіх мясцовых адрозненнях мела агульныя рысы. На змену мастацтву Адраджэння ў XVII ст. прыйшлі новыя мастацкія стылі: барока і класіцызм. У мэтах распаўсюджвання сваіх ідэй асветнікі актыўна выкарыстоўвалі літаратуру і мастацтва.

**Вы даведаецеся.** *Асноўныя стылі еўрапейскага мастацтва і літаратуры XVII–XVIII стст. Якія выбітныя творы з'явіліся ў гэты час. Ці ёсць пераемнасць паміж эпохамі Рэнесансу і Асветніцтва.*

**1. Дасягненні барока.** У першай палове XVII ст. велічныя і стрыманыя творы мастацтва Рэнесансу саступілі месца творам, выкананым у стылі барока (ад італ. *barocco* — дзіўны, мудрагелісты). Гэты стыль узнік у канцы XVI ст. у Італіі, распаўсюдзіўся ў іншыя краіны Еўропы і Амерыкі і праіснаваў да сярэдзіны XVIII ст. Барока было пераважным мастацкім стылем перш за ўсё ў тых краінах, дзе панавала каталіцкая царква (Італія, Іспанія, германскія дзяржавы, Польшча і інш.).



Фантан Трэві ў Рыме. Архітэктар *Нікала Сальві.* 1732–1762 гг.

Для барока характэрныя веліч і пышнасць, імкненне ўздзейнічаць на пачуцці чалавека. У мастацтве барока цесна перапляталіся рэальнае (сапраўднае) і ўяўнае. Вялікае значэнне ў ім мае відовішчнасць і дэкаратыўнае аздабленне. У стылі барока ствараліся парадныя партрэты, дэкаратыўны жывапіс і скульптура, паркавыя і палацавыя ансамблі, культавая (рэлігійная) архітэктура.

Гэты стыль распаўсюдзіўся таксама ў літаратуры (паэзіі і прозе), драматургіі.

У стылі барока пабудаваны сусветна вядомыя архітэктурныя ансамблі, цэрквы, палацы і фантаны Рыма. Найбуйнейшым майстрам гэтага стылю быў прыдворны архітэктар і скульптар Рымскіх Пап Джавані Ларэнца Берніні (1598–1680). Самы вядомы яго твор — грандыёзны ансамбль плошчы перад саборам Святога Пятра ў Рыме. У пачатку XVIII ст. у многіх краінах Еўропы былі створаны пышныя палацава-паркавыя ансамблі.



Палац Сан-Сусі ў г. Патсдам (Германія). 1745–1747 гг.

*Якія архітэктурныя элементы сведчаць, што палац Сан-Сусі і фантан Трэві пабудаваны ў стылі барока?*

**2. Вялікія мастакі XVII ст.** Заснавальнікам рэалістычнага кірунку ў жывапісе стаў Мікеланджэла Мерызі, празваны Караваджа (1573–1610). Многія яго творы адносяцца да бытавога жанру. Героямі палотнаў мастака станавіліся карцёжнікі, шулеры, варажбіткі і інш. («Лютніст», «Гульцы»). Аднак галоўная тэма яго карцін — рэлігійная. Сапраўднасць,



*Караваджа.* Успенне Марыі. 1606 г.

*Якія дэталі карціны пацвярджаюць імкненне мастака да рэалістычнага тлумачэння сюжэта?*



*Дыега Веласкес.* Папрадухі. Каля 1657 г.

рэалістычнасць герояў твораў Караваджа (сучаснае адзенне, знаёмая абстаноўка і г. д.) такая, што многія заказчыкі часам адмаўляліся ад яго карцін. Яны лічылі, што ў палотнах на старажытныя рэлігійныя сюжэты (напрыклад, «Палажэнне ў труну», «Успенне Марыі») няма набожнасці, яны занадта сучасныя.

«Залаты век» іспанскага жывапісу звязаны з імем мастака ***Дыега Веласкеса*** (1599—1660). Каля сарака гадоў ён быў прыдворным жывапісцам іспанскага караля Філіпа IV. У апошнія гады жыцця мастак стварыў тры самыя вядомыя свае творы: «Венера з люстэркам», «Меніны» (так называлі фрэйлін, якія з дзяцінства служылі прынцэсам) і «Папрадухі». На палатне «Меніны» адлюстраваная маленькая інфанта (прынцэса) Маргарыта ў атачэнні прыдворных. Уся яна нібыта ў арэоле яркага святла. Шмат паветра і сонечнага святла на палатне «Папрадухі», дзе Веласкес узнавіў атмасферу працы і паўсядзённага жыцця простых людзей.

Велізарнай папулярнасцю ў сучаснікаў карыстаўся фламандскі мастак ***Пітэр Паўль Рубенс*** (1577—1640). Ён нарадзіўся ў Германіі, але



*Пітэр Паўль Рубенс.*
Паляванне на тыграў і львоў. 1618 г.

*Карціна «Паляванне на тыграў і львоў» прысвечана паляванню на дзікіх, экзатычных для Еўропы жывёл. Якія жывёлы на ёй адлюстраваныя? Ці праўдападобны сюжэт паказаў мастак? Падумайце, да каго падобны адзін з герояў карціны, што раздзірае пашчу льву.*



*Рэмбрант.* Вяртанне блуднага сына. Каля 1668—1669 гг.



*Рэмбрант.* Начная варта. 1642 г.

*Апішыце карціну. Якія гістарычныя падзеі яна адлюстроўвае? Выкарыстайце дадатковы матэрыял.*

адукацыю атрымаў і жыў у горадзе Антверпене (Фландрыя). Яму замаўлялі карціны манархі розных краін Еўропы, бюргеры і царква. Ягонай творчасці ўласцівае імкненне да велічы і пышнасці. Карціны Рубенса поўныя жыцця і бурлівага руху. Ён любіў антычнасць і часта на сваіх палотнах звяртаўся да старажытных міфаў. З глыбокім рэалізмам (праўдзівасцю) мастак перадаваў карціны прыроды. У яго творчасці ярка выявіліся рысы барока: дынамізм (рух) і эмацыйнасць.

XVII ст. — час станаўлення і росквіту галандскага жывапісу, які характарызаваўся імкненнем да праўдзівага адлюстравання навакольнага свету і паўсядзённага жыцця. Вяршыняй галандскага жывапісу гэтай пары стала творчасць ***Рэмбранта Харменса ван Рэйна*** (1606—1669). Будучы мастак нарадзіўся ў сям'і багатага млынара, вучыўся

ў Лейдэнскім універсітэце, які пакінуў дзеля заняткаў жывапісам. У пару найбольшага творчага поспеху знаходзіўся пад уплывам італьянскага барока.

У 1642 г. Рэмбрант стварыў адну з сваіх самых знакамітых карцін «Начная варта» — групавы партрэт стралковай роты, поўны рэалізму і высокай паэзіі. Мастак ствараў палотны на тэмы Свяшчэннага Пісання, адлюстроўваў побыт простых людзей, як, напрыклад, у карціне «Святая сям'я». Завяршэннем творчасці Рэмбранта стала знакамітае 141—143 палатно «Вяртанне блуднага сына».

**3. Дасягненні класіцызму.** Амаль адначасова з барока зацвярджаўся новы стыль — класіцызм (ад лац. *classicus* — узорны). Ён з'явіўся прамым працягам мастацкай культуры эпохі Адраджэння. Прадстаўнікі класіцызму, як і творцы перыяду Рэнесансу, захапляліся антычным мастацтвам. Але пры гэтым класіцысты лічылі, што мастацтва павінна быць велічным, ясным і строгім, праўдападобным і без крайнасцей, характэрных для барока. Прадстаўнікі класіцызму, ствараючы свае творы, прытрымліваліся строга вызначаных правілаў. Яны таксама надавалі вялікае значэнне выхаваўчай ролі мастацтва, якое, на іх думку, павінна вучыць чалавека стойкасці і ўменню падпарадкоўваць асабістыя інтарэсы дзяржаўным, пачуцці — розуму.




Асноўныя рысы класіцызму

Вялікі ўклад у развіццё літаратуры і мастацтва класіцызму зрабілі французы. У XVII ст. небывалага росквіту дасягнула французская драматургія. У ёй адрознівалі два жанры: «высокі» і «нізкі». Да першага адносілі трагедыю, бо яе героямі выступалі буйныя гістарычныя асобы — каралі, палкаводцы, імператары, а таксама персанажы антычнай міфалогіі.

Паводле законаў гэтага жанру дабро заўсёды перамагае зло, а розум пераважае над пачуццямі. Знакамітымі прадстаўнікамі жанру трагедыі ў Францыі былі П’ер Карнэль і Жан-Батыст Расін.

«Нізкім» жанрам драматургіі лічылі камедыю. Яе героямі з’яўляліся звычайныя людзі — выхадцы з розных саслоўяў. Тэмы браліся, як правіла, з навакольнага жыцця. Камедыі высмейвалі паўсядзённыя заганы і недахопы людзей. Французскую камедыю эпохі класіцызму праславіў знакаміты драматург, сын каралеўскага шпалерніка Жан-Батыст Паклен (1622–1673), вядомы пад псеўданімам Мальер. Пра змест яго камедый лёгка здагадацца па іх назвах: «Тарцюф, або Падманшчык», «Скнара», «Мешчанін у дваранстве».

При ўсіх адрозненнях агульным для трагедыі і камедыі было тое, што заганы і вартасці герояў дакладна размяжоўваліся. На працягу ўсяго аповеду станоўчы персанаж заставаўся станоўчым, адмоўны — адмоўным.

Драматургія аказала вялікі ўплыў на развіццё музыкі. У пачатку XVII ст. з’явіўся асаблівы жанр музычнага мастацтва — опера. У ёй цесна знітаваны сцэнічнае дзеянне, вакальная і інструментальная музыка, а таксама выяўленчае мастацтва. Першы оперны тэатр адкрыўся ў Венецыі. З часам опера стала папулярным відам



Фасад палаца Версаль у прыгарадзе Парыжа. Другая палова XVII ст.

*Чаму Версаль можна прылічыць да выбітных архітэктурных помнікаў класіцызму?*

мастацтва. Спачатку яна распаўсюдзілася ў Італіі, а затым у астатніх краінах Еўропы.

Сусветна праслаўленым узорам архітэктуры класіцызму стала рэзідэнцыя французскага караля ў Версалі, недалёка ад Парыжа.

**4. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры XVIII ст.** У XVIII ст. на змену махлярскаму раману, у якім апавядалася пра прыгоды спрытнага прайдзісвета і авантурыста, прыйшоў асветніцкі, павучальны, выхаваўчы раман. Літаратурныя творы таго часу былі напоўнены крытычным, філасофскім зместам. З'яўляліся раманы ў пісьмах, споведзі, дзённікі.

### Ідэі Асветніцтва ў літаратуры Заходняй Еўропы

143—147

| Пісьменнік | Назва твора | Сутнасць твора |
|---|---|---|
| *Даніэль Дэфо*, англійскі пісьменнік | Раман «Рабінзон Круза» | Раман напісаны ў форме дзённіка, дзе герой расказвае, што з ім адбывалася на бязлюдным востраве. Даніэль Дэфо ўслаўляў стваральную працу чалавека, яго прадпрымальнасць, упартасць у дасягненні мэты |
| *Джонатан Свіфт*, англійскі пісьменнік | Раман «Падарожжы Гулівера» | Раман — не проста займальны, прыгодніцкі твор. Гэта яшчэ і дасціпная сатыра на грамадства таго часу. Свіфт падвяргае бязлітаснай крытыцы грамадскія заганы: самадурства, сквапнасць |
| *П'ер дэ Бамаршэ*, французскі драматург | Камедыі «Севільскі цырульнік» і «Жаніцьба Фігаро» | Творы прасякнуты асветніцкімі матывамі. Галоўны іх герой — слуга Фігаро, спрытны, таленавіты і дзёрзкі. Ён супрацьпастаўляецца бяздзейным і лянівым арыстакратам |
| *Фрыдрых Шылер*, нямецкі паэт і драматург | Трагедыя «Разбойнікі» | У трагедыі паказаны маладыя людзі, якія сталі разбойнікамі ў знак пратэсту супраць існуючых парадкаў |
| | Драма «Вільгельм Тэль» | У драме ўсхваляецца барацьба швейцарцаў супраць аўстрыйскіх Габсбургаў. Галоўныя героі твора — простыя людзі: пастухі, рыбакі, паляўнічыя |

| Пісьменнік | Назва твора | Сутнасць твора |
|---|---|---|
| *Іаган Вольфганг Гётэ,* нямецкі пісьменнік | Драма «Гёц фон Берліхінген» | Драма прысвечана Сялянскай вайне. У творы створаны вобраз героя — абаронцы ўсіх прыгнечаных і змагара за аб'яднанне Германіі |
| | Раман у лістах «Пакуты юнага Вертэра» | Галоўны герой рамана — адукаваны юнак з бюргерскай сям'і, які пакутуе праз фанабэрыстасць дваран і крывадушнасць грамадства |

*Выкарыстоўваючы матэрыялы табліцы, раскажыце, якія ідэі Асветніцтва адбіліся ў творах літаратуры.*

**5. Дасягненні музычнага мастацтва.** Вяршыняй музычнага мастацтва XVIII ст. з'яўляюцца творы Баха і Моцарта. Нямецкі кампазітар ***Іаган Себасцьян Бах*** (1685–1750) нарадзіўся ў сям'і патомных музыкаў. Ён пісаў музыку ў многіх музычных жанрах, але асабліва праславіўся сваімі творамі для аргана. Бах — аўтар больш чым 1000 твораў ва ўсіх значных жанрах свайго часу.



Іаган Себасцьян Бах. Мастак *Эліяс Готліб Хаўсман.* 1748 г.



Моцарт са сваёй сям'ёй (у цэнтры — Вольфганг, злева — яго сястра, справа — бацька, на сцяне — партрэт маці). Мастак *Іаган Непамук дэла Крочэ.* 1781 г.

Аўстрыйскі кампазітар ***Вольфганг Амадэй Моцарт*** (1756—1791) быў незвычайна адораным чалавекам. Яшчэ ў дзяцінстве ён праславіўся як кампазітар і музыкант-віртуоз. У венскі перыяд свайго жыцця Моцарт стварыў оперныя шэдэўры «Вяселле Фігаро», «Дон Жуан» і «Чароўная флейта». Асабліва яскрава ідэалы Асветніцтва выяўлены ў оперы «Чароўная флейта». У ёй распавядаецца пра тое, як прынц Таміна, пераадольваючы перашкоды, самастойна знаходзіць шлях да ісціны і дзякуючы ўласным намаганням здабывае шчасце і мудрасць.

*Адным з найвялікшых твораў Баха сталі «Страсці па Матфею». Чаму прысвечаны гэты твор?*

*Такім чынам, XVII—XVIII стст. адзначыліся новым вітком у развіцці еўрапейскай мастацкай культуры. У гэты час была створана вялікая колькасць выдатных твораў выяўленчага мастацтва, музыкі, літаратуры, архітэктурных помнікаў у стылі барока і класіцызму, якія ўвайшлі ў скарбніцу сусветнай культуры. Вялікі ўплыў на развіццё мастацтва і літаратуры аказвалі ідэі Асветніцтва.*

***Ключавыя словы:*** *барока, класіцызм, Караваджа, Дыега Веласкес, Пітэр Паўль Рубенс, Рэмбрант, Мальер.*

**Пытанні і заданні**

1. Якія асноўныя стылі ўзніклі і атрымалі развіццё ў XVII–XVIII стст.? У якіх краінах і чаму?
2. Складзіце схему «Асноўныя рысы барока», выкарыстоўваючы матэрыял параграфа.
3. Назавіце асноўныя рысы класіцызму. Чым, на ваш погляд, адрозніваецца архітэктура класіцызму і барока?
4. Абмяркуйце ў класе сюжэт знакамітай карціны Рэмбранта «Вяртанне блуднага сына». Якія якасці чалавека адлюстраваў у карціне мастак? Ці лічыце вы іх найважнейшымі для кожнага з нас? Чаму?
5. Падбярыце на кожную характэрную рысу класіцызму прыклад (ілюстрацыю) або падрыхтуйце прэзентацыю (віртуальную выставу) па тэме.
6. Уявіце, што вы жывяце ў эпоху Асветніцтва і вырашылі наведаць мерапрыемства, дзе чакаюць знакамітага Даніэля Дэфо. Якія пытанні вы б задалі пісьменніку?

**7.** Паслухайце адзін з твораў І. С. Баха. Намалюйце свае ўражанні ад твора.

**8.** Падрыхтуйце інфаграфіку пра жыццё і дзейнасць В. А. Моцарта.

# § 16. Французская рэвалюцыя




**Успомніце.** *Што такое рэвалюцыя? Калі і дзе адбыліся першыя буржуазныя рэвалюцыі? Якія іх вынікі?*

Французская рэвалюцыя XVIII ст. — адна з найважнейшых падзей сусветнай гісторыі. Яна была вынікам незадаволенасці розных пластоў французскага грамадства феадальнымі перажыткамі. Да гэтага часу не змаўкаюць спрэчкі аб характары рэвалюцыі, яе значэнні і наступствах.

**Вы даведаецеся.** *Якімі прычынамі была выклікана Французская рэвалюцыя. Якія змены ў Францыі адбыліся ў ходзе рэвалюцыі. Як падзеі канца XVIII ст. у Францыі паўплывалі на краіну і на ход сусветнай гісторыі.*

**1. Прычыны рэвалюцыі.** У Францыі даўно пачалі складвацца капіталістычныя адносіны. Але іх развіццю перашкаджалі феадальныя абмежаванні — абсалютысцкая ўлада манарха і саслоўныя прывілеі духавенства і дваранства. Гэтыя два саслоўі карысталіся адной з найважнейшых прывілей — не плаціць падаткі ў каралеўскую казну.

Найбольш цяжкім было становішча сялян (каля 20 млн), якія выплачвалі пазямельны падатак дзяржаве, феадальную рэнту — свайму